## Сусветны форум кафедраў ЮНЕСКА

**13 – 15 лістапада 2002 г.** у Парыжы адбыўся Сусветны форум сеткі кафедраў ЮНЕСКА, прысвечаны 10–й гадавіне яе стварэння. Удзел у форуме прымалі загадчык кафедры энергазахавання і аднаўляльных крыніц энергіі Беларускага нацыянальнага тэхнічнага універсітэта В.Баштавы і дырэктар Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі Ю.Кашынскі.

З прывітальным словам да ўдзельнікаў Сусветнага форуму звярнуўся Генеральны дырэктар ЮНЕСКА К.Мацуура, які адзначыў важкі практычны ўклад сістэмы кафедраў у дасягненне стратэгічных мэт арганізацыі і заклікаў да актыўнага садзейнічання праграмнай дзейнасці ў галіне вышэйшай адукацыі. Адбылася цырымонія ўручэння ўзнагарод ЮНЕСКА кафедрам, якія дамагліся найбольш значных і плённых поспехаў. Ганаровай узнагародай была адзначана шматгадовая актыўная праца кафедры ЮНЕСКА па энергазахаванні і аднаўляльных крыніцах энергіі, якая дзейнічае ў Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэце. Выкарыстоўваючы нагоду правядзення Сусветнага форуму, беларускія ўдзельнікі правялі мэтанакіраваную працу па падрыхтоўцы да адкрыцця ў Беларусі яшчэ адной кафедры ЮНЕСКА, ініцыятарам стварэння якой выступіў Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі.

Па выніках форуму былі прыняты рэкамендацыі да праекта праграмы ЮНЕСКА на 2004—2005 гг.